Журнал Белорусского государственного университета. История. 2018. № 2. С. 68–74
Journal of the Belarusian State University. History. 2018. No. 2. С. 68–74

*УДК 94(476)«1921/1939»*

# ИНДУСТРИАЛИЗАЦИЯ БЕЛОРУССКОГО СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА В 1921–1939 гг.: ТРАНСФОРМАЦИЯ СОДЕРЖАНИЯ

***С. Н. ХОДИН***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуются проблемы советской модернизации белорусской деревни в 1921–1939 гг. на основе системно-функционального подхода, который позволяет уточнить роль традиции как фактора, определяющего направленность и специфику преобразований и сохраняющего свое влияние в период трансформации общества. Отмечается неоднородность понятий «индустриализация» и «индустриализация сельского хозяйства», а также их форм и направлений в БССР на протяжении межвоенного периода. Сделан вывод о том, что на первом этапе (в 1924–1928 гг.) индустриализация сельского хозяйства осуществлялась на основе взаимодействия индивидуальных и коллективных хозяйств как производителей, когда через кооперационные формы организовывались закупка, сбыт и переработка сельскохозяйственной продукции. Указано, что с 1929 г. акцент в процессе модернизации переносится на механизацию основных сельскохозяйственных процессов, фундаментом которой являлась тракторизация. Констатируется, что в течение 1929–1939 гг. создание машинно-тракторных станций не обеспечило существенной механизации сельскохозяйственного производства в Белорусской ССР, однако способствовало наработке опыта, подготовке кадров и в перспективе создавало задел для собственного производства сельскохозяйственной техники.

***Ключевые слова:*** модернизация; системно-функциональный подход; традиция; трансформация; индустриализация; индустриализация сельского хозяйства; машинно-тракторные станции; кооперация.

# ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў 1921–1939 гг.: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЗМЕСТУ

***С. М. ХОДЗІН***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуюцца праблемы савецкай мадэрнізацыі беларускай вёскі ў 1921–1939 гг. на аснове сістэмна-функцыянальнага падыходу, які дазваляе ўдакладніць ролю традыцыі як фактару, што вызначае накіраванасць і спецыфіку пераўтварэнняў і захоўвае свой уплыў у перыяд трансфармацыі грамадства. Адзначаецца неаднароднасць паняццяў «індустрыялізацыя» і «індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі», а таксама іх форм і кірункаў у БССР у міжваенны час. Зроблена выснова аб тым, што на першым этапе (у 1924–1928 гг.) індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі ажыццяўлялася на аснове ўзаемадзеяння індывідуальных і буйных абагульненых гаспадарак як вытворцаў, калі праз кааперацыйныя формы з сялянскімі індывідуальнымі гаспадаркамі арганізоўваліся закупка, збыт і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі. Сцвярджаецца, што пачынаючы з 1929 г. акцэнт у працэсе мадэрнізацыі пераносіцца на механізацыю асноўных сельскагаспадарчых працэсаў, фундаментам якой з’яўлялася трактарызацыя. Канстатуецца, што на працягу 1929–1939 гг. стварэнне машынна-трактарных станцый не забяспечыла істотную механізацыю сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларускай ССР, аднак спрыяла напрацоўцы вопыту, падрыхтоўцы кадраў і ў перспектыве стварала зачын для ўласнай вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

***Ключавыя словы:*** мадэрнізацыя; сістэмна-функцыянальны падыход; традыцыя; трансфармацыя; індустрыялізацыя; індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі; машынна-трактарныя станцыі; кааперацыя.

**Образец цитирования:**
Ходзін С. М. Індустрыялізацыя беларускай сельскай гаспадаркі ў 1921–1939 гг.: трансфармацыя зместу // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2018. № 2. С. 68–74.

**For citation:**
Khodzin S. M. Industrialization of Belarusian agriculture in 1921–1939: transformation of content. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2018. No. 2. P. 68–74 (in Belarus.).

**Автор:**
***Сергей Николаевич Ходин*** – доктор исторических наук, доцент; проректор по учебной работе и интернационализации образования.

**Author:**
***Siarhei M. Khodzin***, doctor of science (history), docent; vice-rector for academic affairs and internationalization of education.
*skhodzin@mail.ru*

# INDUSTRIALIZATION OF BELARUSIAN AGRICULTURE IN 1921–1939: TRANSFORMATION OF CONTENT

*S. M. KHODZIN*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article is devoted to the problems of Soviet modernization of the Belarusian village in 1921–1939. The research is based on the systematic and functional approaches which allow to clarify the role of tradition as a determinant of the direction and special character of the transformations and preserving their influence in the society during the period of its transformation. The article notes the heterogeneity of the concepts of «industrialization» and «industrialization of agriculture» as well as their forms and directions in the BSSR during the interwar period. It is concluded that the first stage (in 1924–1928) industrialization of agriculture was carried out on the basis of the interaction of individual and collective farms as manufacturers, when the purchase, sale and processing of agricultural products were organized through cooperative forms. At that time a purchase, marketing and processing of agricultural products were organized through cooperative forms with peasant individual farms. Since 1929 the focus is shifted from modernization to the main processes of agricultural mechanization of which tractorization was the foundation. During 1929–1939 the establishment of machine-and-tractor stations didn't predetermine the significant mechanization of agricultural production in the Byelorussian SSR but facilitated the dissemination of practices, training and created a reserve for future growth of own agricultural machinery.

***Key words:*** modernization; systematic and functional approaches; tradition; transformation; industrialization; industrialization of agriculture; machine-and-tractor stations; cooperation.

Паняцце «індустрыялізацыя» ў гістарыяграфіі ў дачыненні да сельскай гаспадаркі амаль не ўжываецца і акрэсліваецца пераважна як паскоранае развіццё цяжкай прамысловасці, індустрыяльныя пераўтварэнні, што адбываліся ў горадзе. Разам з тым пры самых розных падыходах да вызначэння і сутнасці мадэрнізацыі большасць даследчыкаў сыходзіцца на думцы, што гэта з'ява мае комплексны, працяглы і шматварыянтны характар. Сістэмна-функцыянальны падыход дазваляе вызначыць ролю традыцыі як фактару, які не толькі шмат у чым вызначае накіраванасць і спецыфіку пераўтварэнняў, але і захоўвае свой уплыў у перыяд трансфармацыі грамадства. Для Беларусі з сярэдзіны XVIII ст. характэрным з'яўлялася размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў у сельскай мясцовасці, бліжэй да крыніц сыравіны і таннай працоўнай сілы. Чаму ж гэтыя з'явы, што вызначаліся як «індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі», не могуць разглядацца ў якасці паказчыка мадэрнізацыі?

На XI канферэнцыі (VI з'ездзе) КП(б)Б, якая праходзіла 15–19 сакавіка 1922 г., наркам земляробства БССР А. С. Славінскі адносна прапаноў аб развіцці розных форм гаспадарання заявіў: «Вы называеце гэта новай эканамічнай палітыкай? Гэта анархія, і анархію неабходна спыніць»[1]. Ён заклікаў абапірацца на камуны і сельскагаспадарчыя арцелі. Каб зразумець, чаму пазіцыя наркама атрымала падтрымку партыйцаў, неабходна ўлічваць не толькі рэвалюцыйны падыход да справы. Раздзел памешчыцкіх уладанняў, дзе ствараліся калектыўныя гаспадаркі, ставіў пад пагрозу дзейнасць перапрацоўчых прадпрыемстваў, якія існавалі на тэрыторыі былых маёнткаў. Аксіяматычным вызначалася і разуменне таго, што менавіта буйныя гаспадаркі ў Расійскай імперыі (з улікам іх удзельнай вагі ў агульнай зямельнай плошчы) з'яўляліся асноўным пастаўшчыком таварнага збожжа.

Перыяд 1920–30-х гг. не быў для Беларусі этапам індустрыялізацыі, калі разумець яе як пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці. У такім кантэксце мадэрнізацыя ў рэспубліцы праходзіла ў другой палове 1940-х – 1950-я гг. Беларусь пераўтварылася ў індустрыяльную частку Савецкага Саюза на мяжы 1950–60-х гг., калі колькасць гарадскога насельніцтва перавысіла колькасць сельскіх жыхароў. Разам з тым пазначаны перыяд дазваляе даследаваць не толькі працэсы трансфармацыі гаспадарчай палітыкі, але і змены ў поглядах на адзін з найважнейшых складнікаў мадэрнізацыі – індустрыялізацыю.

У 1920-я гг. індустрыялізацыя разглядалася ў больш шырокім кантэксце – як працэс, які закранае ўласна індустрыю і сельскагаспадарчую вытворчасць [1, с. 156, 229; 2, с. 31] Прамысловая вытворчая дзейнасць у сельскай гаспадарцы называлася ў 1920-я гг. «чацвёртым сектарам» прамысловасці (пасля дзяржаўнай прамысловасці, прамысловай кааперацыі і прамысловай вытворчасці спажывецкай кааперацыі).

Другі напрамак індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі акрэсліваўся па меры росту вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі, перш за ўсё трактарнай. Узровень яе прымянення на пачатку 1920-х гг. быў невысокім нават у ЗША і абмяжоўваўся пераважна земляробствам. Так, у 1925 г. на амерыканскіх фермах з дапамогай энергіі людзей і жывёл было выраблена 86 млн конскіх сіл працы, а пры дапамозе механічнай сілы – 3 млн конскіх сіл, гэта значыць

[1]Стенограмма VI съезда (XI конференции) КП(б)Б Белоруссии. 15–19 марта 1922 г. // Нац. арх. Рэсп. Беларусь (далее – НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 688. Арк. 192, 219, 220. (Тут і далей пераклад наш. – *С. Х.*)

усяго каля 3 % [3]. У СССР адным з пачынальнікаў дадзенай справы быў В. Д. Бацюшкаў. Менавіта ён падрыхтаваў абгрунтаванне шырокага прымянення трактарнай тэхнікі, адстойваў ідэю стварэння факультэтаў індустрыяльнага земляробства ва ўстановах вышэйшай адукацыі. У сярэдзіне 1926 г. вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі разам з яе ўвозам дасягнула ўзроўню 1913 г. Расійскай імперыі, пры гэтым да 70 % трактарнай тэхнікі выкарыстоўвалася пераважна пры ворыве [1]. Ва ўмовах малазямелля і забалочанасці глебы, драбленне сялянскіх гаспадарак і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі магчымасці прымянення тэхнікі на значнай частцы Беларусі былі дастаткова абмежаванымі.

Калектывізацыя паступова акрэслівала разуменне новых магчымасцей. Як адзначаў Д. Ф. Прышчэпаў, «палітыка фарсіраванай індустрыялізацыі Савецкага Саюза з'яўляецца мерапрыемствам зусім рэальным, і праз утварэнне велізарных электрычных асяродкаў, праз адкрыццё новых буйных прамысловых прадпрыемстваў і пераабсталяванне старых каласальна пашыраецца тэхнічная база індустрыі, якая пачынае браць на буксір усе іншыя»[2] [4, с. 54]. Свае перавагі буйныя гаспадаркі маглі выявіць толькі пры наяўнасці неабходнай колькасці складанай сельскагаспадарчай тэхнікі. Так, А. В. Чаянаў падкрэсліваў: «Трактары, уборачныя машыны павінны быць найбольш шырока распаўсюджаны ў калгасах, таму што яны будуць выгадныя нават у тым выпадку, калі іх бухгалтарская рэнтабельнасць будзе нікчэмная ці нават адмоўная» [5, с. 348]. Між тым забеспячэнне калектыўных гаспадарак складанай сельскагаспадарчай тэхнікай ішло дастаткова павольна. У 1926/27 гаспадарчы год у сярэднім на 2 калгасы меліся 1 сенакасілка, 1 сеялка, 1 конныя граблі, 1-2 культыватары і г. д. На кожныя 100 калгасаў прыходзіліся 6 трактароў. З 1927/28 гаспадарчага года, каб палепшыць стан забеспячэння калектыўных гаспадарак складанай сельскагаспадарчай тэхнікай, быў рэзка абмежаваны яе продаж прыватным асобам (апошнія змаглі набыць у гэтым годзе толькі 6 % складаных машын)[3].

Кіраўніцтва Наркамзема ў другой палове 1920-х гг. адзначала неабходнасць пашырэння механізацыі ў цэлым, і найперш у сферы перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Розных машын і прылад у 1927 г. завозілася ў Беларусь на суму 8 502 201 руб. Як меркаваў Д. Ф. Прышчэпаў, у гэтых адносінах насельніцтва павінна быць цалкам забяспечана. Неабходныя сродкі для крэдытавання насельніцтва былі асігнаваны і пераведзены на месцы, уся тэхніка прадавалася ў крэдыт. У сферы вытворчасці ў рэшце рэшт вырашалася пытанне аб перавагах буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай, адзінаасобнай. Даследчык 1920-х гг. К. Кіндзееў сцвярджаў: «Толькі больш вытворчая гаспадарка ў параўнанні з сялянскай вырашыць лёс калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў станоўчым для яе сэнсе» [6, с. 69]. Такая пастаноўка пытання была цалкам натуральнай і заканамернай ва ўмовах магчымасці выбару розных форм кааператыўнага будаўніцтва менавіта ў 1920-я гг. Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці БССР у кірунку мяса-малочнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур да сярэдзіны 1920-х гг. выявіла запавольванне тэмпаў калгаснага руху і ўзмоцнены рост простых відаў кааперацыі, якія калектывізавалі толькі збыт і перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак іх развіццё ў другой палове 1920-х гг. сутыкнулася з невырашанасцю збожжавай праблемы, гэта значыць той сферы, у якой перавагі буйной гаспадаркі праяўляліся больш хутка і наглядна, бо менавіта на вытворчасць збожжа былі разлічаны машыны, якія з'явіліся ў той час.

Узнаўленне эканомікі да сярэдзіны 1920-х гг. пры захаванні існаваўшых рынкаў збыту і адсутнасці тэхнічных сродкаў механізацыі дадзенай вытворчасці абумовіла бесперспектыўнасць калектывізацыі ў Беларусі з мэтай павелічэння вытворчасці збожжа. Адначасова драбленне сельскагаспадарчай вытворчасці і памяншэнне яго таварнай часткі прадвызначылі стагнацыю, па сутнасці, аграрнай эканомікі рэспублікі.

Безумоўным выйсцем з тупіка магло б стаць спалучэнне дробных і буйных гаспадарак у вёсцы, якія б інтэгравалі збыт і перапрацоўку сваёй прадукцыі. Такая тэндэнцыя ў асноўных сваіх рысах акрэслілася ў другой палове 1920-х гг. і атрымала адлюстраванне ў пастанове ЦВК СССР па дакладзе ўрада Беларускай ССР у лютым 1927 г.[4] Вядомай перадумовай гэтага было ўзнаўленне сельскай гаспадаркі і паглыбленне спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі.

З 1926 г. распачаўся таксама працэс перадачы калектыўным аб'яднанням у працоўнае карыстанне падсобных прадпрыемстваў і майстэрань, якія размяшчаліся на іх тэрыторыі. У чэрвені 1928 г., абагульняючы вынікі абследавання калгасаў, ЦСУ БССР адзначыла, што праз індустрыялізацыю калектыўных аб'яднанняў наладжвалася іх сувязь з навакольным сялянствам шляхам перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і абслугоўвання рознага роду майстэрнямі: кузнямі, абутковымі, сталярнымі майстэрнямі і г. д.[5] Адбывалася паступовае гаспадарчае зрошчванне калгасаў з прылягаючымі

[2]Тут і далей цытаты прыводзяцца ў адпаведнасці з сучаснымі нормамі арфаграфіі. – *С. Х.*

[3]2-я сесія Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР VIII склікання : пастановы. Мінск : ЦВК БССР, 1928. С. 24.

[4]Постановления, положения и инструкции ЦИК и СНК БССР, протоколы и выписки из протоколов заседаний СНК БССР // НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 1396. Арк. 90.

[5]Калгасы БССР: папярэднія вынікі абследаванняў калгасаў у 1928 і 1929 гг. Мінск : ЦСУ БССР, 1929. С. 22.

сялянскімі гаспадаркамі ў выніку паслядоўнага абагулення апошнімі асобных вытворчых працэсаў далучэння да агульнага аб'яднання.

Развіццё жывёлагадоўлі ў БССР прадугледжвала станаўленне індустрыі захавання і перапрацоўкі мясной прадукцыі. У Оршы планавалася пабудаваць прадпрыемства па вытворчасці бекону, а ў Мінску на аснове самага новага замежнага абсталявання павінны былі з'явіцца халадзільныя ўстаноўкі ў разліку на 120 тыс. свіных туш у год[6]. Як адзначыў Д. Ф. Прышчэпаў у 1926 г., «такія індустрыяльныя прадпрыемствы даюць мажлівасць пераапрацоўваць сыравіну ўнутры рэспублікі, значна павялічваць прыбытак усёй народнай гаспадаркі, скарыстоўваць беспрацоўных, адначасова развіваць таварнасць сялянскай гаспадаркі і гэтым самым павялічваць яе прыбытак; акрамя таго, ставіць у такую залежнасць дробную сялянскую гаспадарку ад індустрыяльных прадпрыемстваў, пры якой росквіт іх будзе залежаць ад працы прамысловых прадпрыемстваў» [4, с. 55]. У сярэдзіне 1920-х гг. гэта праца вялася амаль выключна па малочнай гаспадарцы.

Стаўленне да перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі як да найважнейшага фактару мадэрнізацыі вёскі з пачаткам суцэльнай калектывізацыі пачало змяняцца. Выключэнне складала льноперапрацоўка, дзе планавалася грандыёзнае капітальнае будаўніцтва – узвядзенне дзясяткаў ільнозаводаў. Першыя крокі па механізацыі ўборкі льну былі зроблены ўжо ў другой палове 1920-х гг. На пачатку 1930-х гг. меркавалася арганізаваць спецыяльны будаўнічы трэст, каб не будаваць ільнозаводы па тры гады[7].

Стварэнне збожжавытворчых саўгасаў у СССР на мяжы 1920–30-х гг. дазваляла толькі часткова вырашыць праблему аграрнай бяспекі краіны. У якасці наступнага кроку разглядалася арганізацыя буйных калектыўных гаспадарак. Неабходнай перадумовай для гэтага станавілася замена найбольш цяжкай фізічнай працы (ворыва, касьба і г. д.) механізаванай. Аднак для стварэння трактарнай вытворчасці патрабаваліся вялікія сродкі. Ва ўмовах адсутнасці знешняй падтрымкі ўзяць іх можна было толькі з вёскі. У такім выпадку калектывізацыя станавілася сродкам канфіскацыі прыбытку і нават неабходных прадуктаў селяніна.

Да завяршэння першай пяцігодкі СССР павінен быў дагнаць ЗША па выпуску сельскагаспадарчых машын у разліку на адзінку плошчы. Па першым пяцігадовым плане планавалася выдзеліць на будаўніцтва заводаў па вытворчасці тэхнікі для сельскай гаспадаркі больш за 234 млн руб., што складала прыкладна 30 % усіх укладанняў у машынабудаванне. Сярод прадпрыемстваў, якія будаваліся, найбуйнейшымі былі завод па вытворчасці камбайнаў у Растове-на-Доне і трактарны завод у Сталінградзе [7, с. 129]. Вызваленне лішку рабочых рук, якія былі запатрабаваны толькі падчас напружаных сельскагаспадарчых работ па пасеве і ўборцы ўраджаю, бачылася не толькі істотным фактарам ліквідацыі аграрнай перанаселенасці ў вёсцы, але і важнай крыніцай рабочай сілы для індустрыі горада, якая з цягам часу расла.

Рэалізацыя ўніфікацыйных падыходаў да індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі прадвызначыла тое, што з 1929 г. найбольш перспектыўным фактарам мадэрнізацыі стала трактарызацыя. Ва ўмовах вострага дэфіцыту сельскагаспадарчай тэхнікі, механізатарскіх кадраў было прынята рашэнне аб стварэнні машынна-трактарных станцый (МТС). Гэта дазволіла сканцэнтраваць падрыхтоўку механізатараў і сельскагаспадарчай тэхнікі ў адной арганізацыі, садзейнічала яе лепшай эксплуатацыі і рамонту. Штуршком да рэалізацыі такой ідэі стаў станоўчы вопыт стварэння на базе трактарнай калоны першай МТС пры саўгасе імя Тараса Шаўчэнкі ў Бярозаўскім раёне Адэскай вобласці (1928). Пастанова Савета працы і абароны СССР «Аб арганізацыі машынна-трактарных станцый» выйшла 5 чэрвеня 1929 г. Быў створаны Усесаюзны цэнтр машынна-трактарных станцый («Трактарацэнтр»), у выніку дзейнасці якога арганізацыя МТС набыла планавы характар. У 1932 г. колькасць МТС у СССР складала ўжо каля 2,5 тыс., а ў 1937 г. – больш за 5,8 тыс. МТС ствараліся пераважна ў збожжавых раёнах [8, с. 159].

Кіраўніцтва БССР імкнулася выкарыстаць гэтыя магчымасці для паляпшэння энергаўзброенасці сельскай гаспадаркі рэспублікі. Так, 11 верасня 1929 г. быў накіраваны ліст сакратару ЦК УКП(б) В. М. Молатаву і старшыні СНК СССР А. І. Рыкаву. Звярталася ўвага на тое, што пры размеркаванні 100 МТС па раёнах СССР для Беларусі не выдзялялася ніводнай станцыі. Выказваючы разуменне таго, што найбольшая канцэнтрацыя трактароў прыпадала на збожжавыя раёны, аўтары ліста адзначалі аргументы на карысць неабходнасці стварыць тры станцыі ў БССР. Асноўнымі з іх з'яўляліся вельмі вострыя праблемы малазямелля і аграрнай перанаселенасці, а таксама імкненне насельніцтва да стварэння калгасаў. У якасці аргумента прыводзілася таксама актуальнасць калектывізацыі для польскага насельніцтва. Па меркаванні аўтараў ліста, стварэнне трох МТС мела б велізарнае палітычнае значэнне [8, с. 147].

Першая МТС у Беларусі пачала дзейнічаць у красавіку 1930 г. у Дзяржынскім раёне. Аднак рашэнне аб яе адкрыцці было прынята яшчэ зімой таго ж года. У гэты ж час праводзілася падрыхтоў-

[6]Дело о постройке беконной фабрики в г. Орше и мясного холодильника в г. Минске // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2336. Арк. 43–44.

[7]Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 20–26 января 1931 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5102. Арк. 170.

чая работа да стварэння МТС. У прыватнасці, дзясяткі юнакоў і дзяўчат прайшлі падрыхтоўку на курсах механізатараў. Гэта было падставай для стварэння жаночай трактарнай брыгады. Тэхнічную аснову першапачаткова склалі амерыканскія трактары «Джон-Дзір», а ў далейшым – савецкія мадэлі «Інтэрнацыянал», «Універсал», «Фардзон-Пуцілавец» [9, с. 141–142; 10, с. 138].

Павелічэнне колькасці МТС дазволіла выпрацаваць адпаведныя формы арганізацыі працы і фінансавання. Асноўнай вытворчай адзінкай стала брыгада. Дырэктар МТС прызначаўся непасрэдна наркаматам земляробства СССР. Да ліку персаналу МТС адносіліся старшы механік (загадчык гаража), раз’язныя механікі, старшы аграном, аграномы па спецкультурах і насенні, аграномы, прымацаваныя да калгасаў, загадчык нафтабазы, бухгалтары (усяго да 38–42 адзінак). Адносіны МТС з калгасамі рэгуляваліся дамовай, якая распрацоўвалася на аснове прыкладнай дамовы, зацверджанай СНК СССР. Калгасы аплачвалі паслугі натуральнай прадукцыяй (збожжам, буракамі, бульбай і г. д.), памер аплаты залежаў ад ураджайнасці сельскагаспадарчых культур. Пасрэднікам выступала Цэнтральная дзяржаўная камісія (ЦДК) па вызначэнні ўраджайнасці. Але яна ў якасці асновы брала біялагічны ўраджай, а не рэальны, пасля абмалоту, што засыпаўся ў свірны і звычайна ў выніку страт і сушкі быў на 20–40 % меншы [12]. На аснове «Прыкладнага статута сельгасарцелі» (1938) вызначаўся абавязак калектываў выкарыстоўваць сельскагаспадарчую тэхніку праз МТС, што звязвала іх і калгасы ў адзіны сельскагаспадарчы комплекс [11, с. 9–11].

На пачатку 1930-х гг. праца МТС не была належным чынам арганізавана. Механізатары не мелі неабходнай вопраткі, абутку, нясвоечасова запісваліся звесткі ў кніжцы працадзён і г. д. Магчыма, па гэтай прычыне канстатавалася адсутнасць дагляду за тэхнікай і яе належнага выкарыстання (да прыкладу, замест чатырох корпусных плугоў навешваліся тры корпусныя). Толькі за ліпень 1932 г. 1204 трактары сістэмы беларускага аддзялення Трактарацэнтру перавыдаткавалі 113,42 т гаруча-змазачных матэрыялаў і не выканалі план па перавозках. Прастоі трактароў дасягалі звыш 50 % («Інтэр» – 53,5 %, «Форд-Пуцілавец» – 59,7 %)[8].

Страты збожжа пры жатве сярпом складалі 4 % ураджаю, а пры ўборцы найбольш распаўсюджанымі і простымі мадэлямі жнярак узрасталі да 10–15 % [7, с. 108]. Вытворчасць камбайнаў дазваляла не толькі механізаваць уборку, але і зменшыць страты ўраджаю. У 1937 г. савецкі камбайн «Сталінец-1» атрымаў дыплом «Гран-пры» на прамысловай выставе ў Парыжы. У 1934 г. камбайнамі было сабрана тры чвэрці саўгаснага ўраджаю. У дачыненні да калгасаў СССР гэта лічба складала ў 1932 г. 0,1 %, а ў 1940 г. – 42 %, трактарнай тэхнікай абслугоўваліся да 94 % усіх плошчаў калектыўных гаспадарак [7, с. 175]. Калі ў 1928 г. рабочая жывёла складала 94,8 % энергетычных магутнасцей сельскай гаспадаркі СССР, то да 1940 г. яе доля скарацілася да 22,3 % [12, с. 486, 505].

У БССР збожжавытворчыя саўгасы мелі меншае распаўсюджанне [12, с. 516–517]. Кіраўніцтва БССР сцвярджала, што ў сітуацыі, калі тэхнічныя ўмовы не стваралі пераваг, калектывізацыя бачылася справай складанай. Разумелі гэта і сяляне. Да прыкладу, нават бяднейшае сялянства Лельчыцкага раёна разважала наступным чынам: «Калектывізацыя – справа добрая, але ж не ў нашым раёне. Вось у другіх раёнах, дзе зямля лепшая і большая, пусціць туды трактары і машыны, тады калгас атрымае больш, як індывідуальнік. У нашым раёне зямлі мала, і дрэнная, і трактары не пусціш, бо завязне ў пяньках і балоце і калгас нічога не даб’ецца»[9]. Даволі часта трактарная тэхніка выкарыстоўвалася не па прызначэнні і нерацыянальна. Так, наркам земляробства П. М. Рачыцкі на Пленуме КП(б) Беларусі 20 студзеня 1931 г. адзначаў: «На трактарах едуць снедаць, студэнтаў возяць»[10].

Калектыўныя гаспадаркі, якія ствараліся на аснове той дрэннай тэхнікі і нізкапрадукцыйнай жывёлы, што мелася ў пераважнай частцы бядняцкага складу калгасаў, пры адсутнасці выяўленых форм арганізацыі працы і размеркавання яе вынікаў, ва ўмовах спецыялізацыі ў кірунку мяса-малочнай жывёлагадоўлі не змаглі ў другой палове 1920-х гг. акрэсліць свае істотныя перавагі. Узбуйненне калгасаў, пачатае на мяжы 1920–30-х гг., выявіла ў шэрагу выпадкаў сваю штучнасць і нерацыянальнасць. Што тычыцца дапамогі з боку дзяржавы, то партыйныя дакументы перапоўнены сведчаннямі аб дрэнным забеспячэнні калектываў. У дакладной запісцы першаму сакратару ЦК КП(б)Б К. Гею адзначалася, што па стане на студзень 1930 г. «сартыровак “Трыумф” завезена 12 %, дыскавых барон – 15 %, барон зігзагавых – 23 %, пружынных барон – 12 %, сеялак розных – 10 %, касілак – 14 % ад плана і г. д. Тут справы вельмі дрэнныя, і мы на месцы ніяк і нічым не можам дапамагчы»[11]. На XXIII

[8]Протокол № 19 заседания секретариата ЦК КП(б)Б от 19 июня 1932 г., документы к нему // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5669. Арк. 16.

[9]Протоколы заседаний секретариата ЦК КП(б)Б от 14 февраля – 25 марта 1931 г., документы к ним // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5118. Арк. 198.

[10]Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 20–26 января 1931 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5102. Арк. 301.

[11]Постановления и циркуляры ЦК, Могилёвского окружкома и Толочинского райкома КП(б)Б, докладные записки, [информация] о ходе выполнения промфинплана по отдельным отраслям промышленности и кооперации БССР за 10 м[еся]цев 1929/30 г., работе Оршанского железнодорожного узла, необходимости выделения кредита для развития животноводства в Лоевском р-не 13 января 1930 г. – 3 февраля 1931 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5069. Арк. 2–6.

з'езде КП(б)Б К. В. Гей прапанаваў: «У свой час ідэю раскулачвання, ідэю калектывізацыі прапаноўвала апазіцыя. Яна не разумела, што да таго часу, пакуль мы не створым сталай машыннай базы, мы не можам стаць на гэты шлях, бо гэты шлях быў бы авантурыстычным»[12]. Пры гэтым, выступаючы пасля яго, наркам земляробства П. М. Рачыцкі вымушаны быў канстатаваць: «Наш трактарны парк складае сёння толькі 400 адзінак на ўсю рэспубліку. Тое ж і з іншымі сельскагаспадарчымі машынамі»[13]. Адначасова падкрэслівалася, што «дагнаць і перагнаць не ёсць фантастычны лозунг»[14].

У дакладных запісках сакратароў райкамаў у ЦК КП(б) Беларусі сцвярджалася, што большасць трактароў патрабуюць капітальнага рамонту, няма запчастак[15]. У параўнанні з прамысловасцю рэспублікі ўзровень механізацыі ў аграрным сектары значна адставаў і склаў у 1928 г. усяго 2 %. Работа вялася пераважна ручным інвентаром, простымі механізмамі. Толькі 15 % гаспадарак мелі сельскагаспадарчыя машыны: сеялкі, жняяркі, малатарні. У 1933 г. вясновае ворыва ў калгасах краіны было механізавана на 24,2 %, малацьба – на 20,6 %. Разам з тым менавіта ў гэты перыяд пачынаецца прыстасаванне тэхнікі і механізмаў да прыродна-геаграфічных умоў і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі (вынаходніцтва бульбакапалкі і інш.).

Нельга адмаўляюць перавагі, неабходнасць і вынікі мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР, аднак патрэбна адзначыць і той факт, што яе ажыццяўленне ва ўнітарных формах, тэмпах і метадах у БССР не дало чаканага выніку, а ў шэрагу выпадкаў нанесла непапраўныя страты для эканомікі рэспублікі. У 1938 г. толькі механізацыя вясенняга ворыва ў БССР перавысіла 50 %, па астатніх відах работ яна не дасягала 10–20 %. Разам з тым страты жывёлы дасягнулі такіх велічынь, што ўзровень 1928 г. быў адноўлены толькі ў другой палове 1960-х гг. [12, с. 445; 18, с. 43–44]. Непапраўнымі былі чалавечыя трагедыі вяскоўцаў.

Такім чынам, індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі змяняла свае формы на розных этапах мадэрнізацыі. Падчас ажыццяўлення яе нацыянальнай мадэлі ў 1924–1928 гг. яна вызначылася як прамысловая вытворчая дзейнасць у сельскагаспадарчым сектары, сфера перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны. На этапе рэалізацыі ўніфікацыйных падыходаў з 1929 г. індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі характарызавалася пераважна як пераход на машынную сістэму вытворчасці ў вёсцы. На з'ездзе ў 1927 г., які ў гістарыяграфіі традыцыйна называецца з'ездам калектывізацыі, менавіта індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі акрэслівалася партыйнымі і савецкімі ўладамі як адзін з найважнейшых фактараў мадэрнізацыі. У далейшым, аднак, акцэнты былі змешчаны да прамысловасці горада.

Практыка мадэрнізацыі беларускай вёскі патрабавала не толькі ўліку традыцыі размяшчэння перапрацоўчай прамысловасці, але і рэальнага стану матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сельскагаспадарчай вытворчасці. Неабходна было шукаць спалучэнне індывідуальных і буйных абагуленых гаспадарак як вытворцаў збожжа, кармоў, арганізацыі селекцыйнай і семяняводчай справы ў вёсцы. Кааперацыйныя формы з вакольнымі індывідуальнымі гаспадаркамі стваралі перспектыву для арганізацыі сумеснай закупкі, збыту і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Пры гэтым індывідуальныя гаспадаркі атрымлівалі дадатковы стымул для свайго развіцця. Дапаможныя прамысловыя прадпрыемствы ў калектыўных гаспадарках садзейнічалі вырашэнню праблемы рацыянальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў, у тым ліку аграрнай перанаселенасці вёскі. Рэалізацыя ўніфікацыйных падыходаў да мадэрнізацыі ў якасці найбольш перспектыўнага фактару вызначыла трактарызацыю. Стварэнне МТС не раскрыла магчымасці дасягнуць значнага ўзроўню механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на працягу 1929–1939 гг. Аднак гэта садзейнічала напрацоўцы вопыту, падрыхтоўцы кадраў механізатараў і ў перспектыве стварала аснову для ўласнай вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Батюшков В. Д.* Индустриализация сельского хозяйства // Плановое хоз-во. 1926. № 5. С. 107–127.
2. *Каратыгин Е. С.* Проблемы индустриализации сельского хозяйства в СССР. М. ; Л. : Гос. изд-во, 1929.
3. *Федотов Н. Д.* Сельскохозяйственное машиностроение и индустриализация СССР. Роль механизации сельского хозяйства [Электронный ресурс] // Плановое хоз-во. 1928. № 2. URL: http://istmat.info/node/43401#p11 (дата обращения: 17.01.2016).
4. *Прышчэпаў З.* Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію // Совет. строительство. 1928. № 3/4. С. 53–62.
5. *Чаянов А. В.* Крестьянское хозяйство : избр. тр. / редкол.: А. А. Никонов (отв. ред.) [и др.]. М. : Экономика, 1989.
6. *Киндеев К.* Коллективные хозяйства. М. : Изд-во Нар. комиссариата Рабоче-Крестьян. инспекции СССР, 1927.

[12]Стенограмма XIII съезда КП(б)Б. 30–31 мая 1930 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4730. Арк. 45.
[13]Там же. Арк. 191.
[14]Там жа. Арк. 38, 187, 191.
[15]Там жа. Арк. 42.

7. *Нефедов С. А.* Аграрные и демографические итоги сталинской коллективизации. Тамбов : Издат. дом Тамб. гос. ун-та, 2013.

8. *Ходзін С. М.* Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939). Мінск : БДУ, 2014.

9. *Валахановіч А. І.* Машынна-трактарныя станцыі // Памяць: Дзяржынскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / уклад. А. І. Валахановіч ; рэдкал.: Л. М. Драбовіч [і інш.]. Мінск, 2004. С. 141–143.

10. *Валахановіч А. І.* Яны пачыналі першымі // Памяць: Дзяржынскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / уклад. А. І. Валахановіч ; рэдкал.: Л. М. Драбовіч [і інш.]. Мінск, 2004. С. 137–139.

11. *Томилин В. Н.* МТС (1928–1958 гг.): исторический опыт и уроки [Электронный ресурс]. URL: http://academy-document.narod.ru/friendsarticles/Victor_tomilin.htm. (дата обращения: 12.11.2013).

12. Народное хозяйство СССР в 1958 г. : стат. ежегодник. М. : Госстатиздат, 1959.

## References

1. Batyushkov V. D. [Industrialization of agriculture]. *Plan. hoz.* [Plan. econ.]. 1926. No. 5. P. 107–127 (in Russ.).

2. Karatygin E. S. Problemy industrializatsii sel'skogo khozyaistva v SSSR [Problems of industrialization of agriculture in the USSR]. Moscow ; Leningrad : Gos. izd., 1929 (in Russ.).

3. Fedotov N. D. [Agricultural engineering and industrialization of the USSR. The role of mechanization of agriculture]. *Plan. khoz.* [Plan. econ.] 1928. No. 2. URL: http://istmat.info/node/43401#p11 (date of access: 17.01.2016) (in Russ.).

4. Prishchepov C. [Tasks reconstruction of agriculture in the current pasevkampaniyu]. *Sov. stroit.* [Sov. constr.] 1928. No. 3/4. P. 53–62 (in Belarus.).

5. Chayanov A. V. Krest'yanskoe khozyaistvo [Peasant farming] : favor. works. Moscow : Ekonomika, 1989 (in Russ.).

6. Kindeyev K. Kollektivnye khozyaistva [Collective farms]. Moscow : Izd. Nar. Komis. Rab.-krestyanskoi insp. SSSR, 1927 (in Russ.).

7. Nefedov S. A. Agrarnye i demograficheskie itogi stalinskoi kollektivizatsii [Agrarian and demographic results of Stalinist collectivization]. Tambov : Izd. Dom Tambov. gos. univ. 2013 (in Russ.).

8. Khodzin S. M. Belaruskaya veska ў mizhvaenny chas: shlyakhi i formy savetskai madernizatsyi (1921–1939) [Belarusian village during the interwar period: the ways and forms of Soviet modernization (1921–1939)]. Minsk : BSU, 2014 (in Belarus.).

9. Valahanovich A. I. [Machine and tractor stations]. In: *Pamjac': Dzjarzhynski rajon* [Memory: Dzerzhinsky district] : hist. and doc. chron. of cities and dist. of Belarus. Minsk, 2004. P. 141–143 (in Belarus.).

10. Valahanovich A. I. [They started the first]. In: *Pamjac': Dzjarzhynski rajon* [Memory: Dzerzhinsky district] : hist. and doc. chron. of cities and dist. of Belarus. Minsk, 2004. P. 137–139 (in Belarus.).

11. Tomilin V. N. [MTS (1928–1958) : historical experience and lessons]. URL: http://academy-document.narod.ru/friendsarticles/Victor_tomilin.htm (date of access: 12.11.2013) (in Russ.).

12. [The national economy of the USSR in 1958] : stat. yearb. Moscow : Gosstatizdat, 1959 (in Russ.).

*Статья поступила в редколлегию 20.02.2018.*
*Received by editorial board 20.02.2018.*